**УДК 930:[94(476)34“17/18]**

# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ГІСТОРЫІ СУДОВЫХ УСТАНОЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XVIII – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX СТАГОДДЗЯ

***канд. гіст. навук, дац. І.Г. ГУШЧЫНСКІ***
***(Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка, Мінск)***

*Аналізуецца гістарыяграфія гісторыі судовых устаноў на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Зроблена выснова, што ў дастаткова поўнай ступені на падставе галоўным чынам заканадаўчых актаў раскрыта судаўладкаванне і яго эвалюцыя на працягу разглядаемага перыяду, паказаны асаблівасці палітыкі розных расійскіх манархаў адносна судова-прававой сферы краю, выяўлена месца і роля мясцовага дваранства ў фарміраванні кадравага складу судовых органаў. Па-рознаму ў гістарыяграфіі трактуюцца і ацэньваюцца такія аспекты, як спроба Кацярыны II укараніць на тэрыторыі Беларусі расійскі судова-адмінстрацыйны лад у канцы XVIII ст., пераўтварэнні ў судовай сістэме пры Паўле I, эфектыўнасць выкарыстання Статута ВКЛ 1588 г. ва ўмовах XIX ст., значэнне яго скасавання Мікалаем I для якасці правасуддзя краю і некаторыя інш. Недастаткова раскрытымі і, адпаведна, перспектыўнымі для далейшага даследавання бачацца наступныя праблемы: роля судовых органаў у сацыяльна-эканамічным развіцці, стасункі паміж судовымі ўстановамі і адміністрацыйнай уладай, функцыянаванне інстытута адвакатуры ў дадзены перыяд.*

***Ключавыя словы:*** *гістарыяграфія, судовая сістэма, судаводства, судаўладкаванне, самадзяржаўе, Расійскай імперыя, Статут ВКЛ, 19 стагоддзе, 18 стагоддзе.*

***Уводзіны.*** Вывучэнне судовых органаў у мінулым стварае ўмовы выкарыстання гістарычнага вопыту пры правядзенні мерапрыемстваў па ўдасканаленні сістэмы правасуддзя на сучасным этапе. Акрамя таго, гэта дазваляе ў больш поўнай ступені рэканструяваць гістарычную рэчаіснасць адпаведнай эпохі, бо суды заўсёды займалі важнае месца ў жыцці грамадства. У іх уладкаванні і дзейнасці знаходзілі адлюстраванне ключавыя рысы сацыяльна-эканамічных адносін і палітычнага жыцця ў дзяржаве ці асобных рэгіёнах, а таксама менталітэту людзей. Далучэнне тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII ст. да Расіі прывяло да карэнных змен у жыцці краю, якія закранулі і мясцовую сістэму правасуддзя. Прычым за адносна непрацяглы перыяд (ад першага падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 г. да 1840 г., калі была канчаткова скасавана дзейнасць Статута ВКЛ) яна неаднаразова падвяргалася пераўтварэнням, якія вынікалі з накірункаў палітыкі імперскіх улад на розных этапах у адносінах да дадзенай тэрыторыі. Гэтая тэма разгледжана ў даволі значнай колькасці прац гістарычнага і прававога характару як спецыяльных, так і ў кантэксце вывучэння іншых праблем. Мэтай дадзенага артыкула з’яўляецца выяўленне ступені даследаванасці судовай сістэмы на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – першай паловы XIX ст., раскрыццё асноўных падыходаў у гістарыяграфіі да тых ці іншых аспектаў, вызначэнне недастаткова вывучаных праблем і перспектыўных накірункаў для далейшых даследаванняў.

***Асноўная частка. Гістарыяграфія XIX – пачатку XX ст.***

Навуковая цікавасць да судаводства і судаўладкавання на тэрыторыі, далучанай да Расіі ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай, узнікла яшчэ ў першай палове XIX ст. Гэта было звязана з працай па кадыфікацыі мясцовых прававых норм і складанні праекта адпаведнага зводу законаў, у падмурак якога павінен быў легчы Статут ВКЛ. У 1837 г. была выдадзена праца “Обозрение исторических сведений о составлении свода местных законов западных губерний” (тэкст даступны ў перавыданні 1910 г. [1]), асноўны матэрыял якой быў падрыхтаваны І. Даніловічам. Асобны раздзел выдання прысвечаны змяненням, якія былі ўнесены ў мясцовае права пасля далучэння дадзенай тэрыторыі да Расіі [1, с. 30–33]. Падкрэсліваецца, што карэктывам у найменшай ступені падвергліся законы грамадзянскага судаводства, бо тыя не супярэчылі “сутнасці вярхоўнага ўладання”, пры гэтым забяспечвалі пераемнасць новых прававых норм з папярэднімі і “змацоўвалі яе вузамі ўласнасці і прыватных выгад” [1, с. 33]. У той жа час у іншай сваёй працы “Kodex Napoleona w porównaniu z prawami polskiemi i litewskiemi” (“Кодэкс Напалеона ў параўнанні з законамі польскімі і літоўскімі”) І. Даніловіч адзначаў, што ў XIX ст. Статут ВКЛ ужо не ў поўнай ступені адпавядаў патрабаванням часу, а многія яго пастулаты сталі анахранізмамі [2, с. 43–45, 56]. Выкарыстанне Статута ў перыяд пасля падзелаў Рэчы Паспалітай і ў наступным прыцягвала ўвагу даследчыкаў: М.М. Навакоўскага [3], С.А. Бершацкага [4], А.Э. Нольдэ [5], Е.М. Вайшвілы [6].

У дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі па разглядаемай праблеме асоба трэба выдзяліць працы М.П. Жуковіча [7, 8]. У іх даволі падрабязна раскрыты структура і функцыі судовых органаў на тэрыторыі, далучанай да Расіі ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай, а таксама захады імперскіх улад (пры Кацярыне II і Паўле I) па рэфармаванні мясцовай судовай сістэмы. М.П. Жуковіч падкрэсліваў імкненне

Кацярыны II “добрым, лагодным, сумленным, паблажлівым і чалавекалюбівым кіраваннем Расійскай імперыі” выклікаць прыхільнасць мясцовага насельніцтва да новай улады. Аднак ён таксама адзначаў недасканаласць у самой Расіі адміністрацыйнага кіравання і суда, перш за ўсё з-за іх змяшэння [7, с. 293]. Вынікам такой супярэчнасці і пры гэтым жадання Кацярыны II арганізаваць правасуддзе на далучаных землях не горш, чым пры Рэчы Паспалітай, стала захаванне тут (нават ва ўсходняй частцы Беларусі пасля ўвядзення “Учреждений для управления губерниями…” 1775 г.) дзеяння норм Статута ВКЛ у сферы грамадзянскага судаводства. Аўтар сцвярджаў, што гэта быў першы вопыт аддзялення суда ад адміністрацыі ў Расіі [7, с. 303]. М.П. Жуковіч станоўча ацаніў распаўсюджанне ў 1778 г. Кацярынай II “Учреждений для управления губерниями…” на тэрыторыю тагачасных Полацкай і Магілёўскай губерняў. На яго думку, гэта стварыла тут стройную сістэму мясцовага суда, асобнага ад адміністрацыі, блізкага да ўсіх класаў насельніцтва, з перавагай у яго складзе выбарнага пачатку [7, с. 110]. Дзеянні Паўла I па пераўтварэннях судовай сістэмы ў Беларускай, Мінскай і Літоўскай губернях аўтар ацэньваў больш крытычна. Ён сцвярджаў, што імкненне да “хуткага ўваскрашэння літоўска-польскай даўніны”, па-першае, пры адсутнасці дастатковага знаёмства з ёй прыводзіла да недарэчнасцей ва ўказах [8, с. 190], па-другое – “павялічвала мяжу”, якая аддзяляла гэтую тэрыторыю ад астатняй Расіі [8, с. 225]. Параўноўваючы палітыку Кацярыны II і Паўла I, М.П. Жуковіч зрабіў у пэўным сэнсе парадаксальную выснову: Кацярына II у накірунку захавання літоўска-польскай юрыдычнай даўніны ў вобласці суда ў “заходнерускіх” губернях зрабіла больш, чым Павел I [8, с. 225].

Варта згадаць яшчэ шэраг даследаванняў гісторыка-прававога характару, у якіх разглядаемая ў артыкуле праблематыка закранаецца ў кантэксце вывучэння больш шырокіх тэм.

У кнізе А.Э Нольдэ “Очерки русского государственного права” [9] пэўная ўвага ўдзелена эвалюцыі сістэмы судовых органаў на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – першай трэці XIX ст. Аўтар паказаў яе абумоўленасць канкрэтнымі палітычнымі абставінамі і асабістымі падыходамі расійскіх манархаў (Кацярыны II, Паўла I, Аляксандра I) да вырашэння праблемы вызначэння статусу далучанай у выніку падзелаў Рэчы Паспалітай тэрыторыі ў складзе імперыі. А.Э. Нольдэ падкрэсліваў аўтаномны характар сістэмы правасуддзя краю пры Паўле I. Дадзеная самастойнасць вызначалася ўласнымі прававымі нормамі, выбарнасцю суддзяў і фінансавай незалежнасцю мясцовых судовых органаў ад дзяржаўнай казны [5, с. 425–428]. “Смяротным прыгаворам” гэтай судовай аўтаноміі, на думку аўтара, стаў закон ад 19 мая 1802 г. паводле якога прызначэнне на выбарныя ад дваранства пасады адбывалася ў адпаведнасці з “Учреждениями для управления губерниями…”. Гэта азначала ўвядзенне трохгадовага тэрміну службы і зацвярджэнне кандыдатур Сенатам і імператарам. Перавод пытанняў самакіравання на нормы агульнаімперскага заканадаўства падрываў аснову аўтаноміі – сваё ўласнае права [9, с. 431]. Адметна, што захаванне дзеяння норм Статута ВКЛ пасля падзелаў Рэчы Паспалітай А.Э. Нольдэ трактаваў як асаблівасці рускага права [9, с. 433].

Спроба ўкаранення “Учреждений для управления губерниями…” 1775 г. на тэрыторыі Беларусі пры Кацярыне II закранута ў працы У.А. Грыгор´ева “Реформа местного управления при Екатерине II (Учреждение о губерниях 7 ноября 1775 г.)” [10]. Аўтар адзначыў недахоп кадраў для судовых і адміністрацыйных органаў новага ўзору, перш за ўсё на прызначаемыя (а не выбарныя) пасады, напрыклад, пракурораў і страпчых [10, с. 324].

У трохтомнай працы С.М. Серадоніна “Исторический обзор деятельности Комитета министров. К столетию Комитета министров (1802–1902)” паказаны такія аспекты ўрадавай палітыкі на тэрыторыі Беларусі, як рэгламентацыя выбараў на судовыя пасады [11, с. 269, 289] і ў цэлым прыцягненне мясцовай шляхты да службы ў сферы правасуддзя [12, с. 243, 13, с. 160], змяненні ў нормах судаводства па злачынствах палітычнага характару [13, с. 179–182].

Праблема адвакатуры на тэрыторыі Беларусі ў разгядаемы перыяд фрагментарна закранута ў працы Я.У. Васькоўскага “Организация адвокатуры”. Аўтар адзначаў, што дадзены юрыдычны інстытут пасля далучэння краю да Расіі атрымаў даволі стройную арганізацыю па германскаму ўзору таго часу [14, с. 154].

Таксама варта ўзгадаць выданне даведачнага характару “Столетний период (1772–1872) русского законодательства в воссоединенных от Польши губерниях и законодательство о евреях (1649–1876)” І.А. Нікоціна [15]. У ім храналагічна і тэматычна сістэматызаваны заканадаўчыя мерапрыемствы (у тым ліку ў судова-прававой сферы) на дадзенай тэрыторыі.

Сістэма судовых органаў і іх кампетэнцыя, а таксама эвалюцыя судовага заканадаўства на тэрыторыі, далучанай да Расійскай імперыі ў выніку 1-га падзелу Рэчы Паспалітай, вельмі падрабязна паказана ў працы фінскага гісторыка У.Л. Лехтанена “Die polnischen Provinzen Russlands unter Katharina II. In den Jahren 1772–1782” (“Польскія правінцыі Расіі пры Кацярыне II. У 1772–1782 гг.”) [16, с. 278–295]. Дадзенае даследаванне, нягледзячы на непасрэдную прывязку яго тэмы да тэрыторыі Беларусі, значны аб’ём і, адпаведна, падрабязнасць раскрыцця разглядаемай праблематыкі, засталося дагэтуль практычна

не запатрабаваным беларускімі гісторыкамі (за выключэннем, напэўна, Я.К. Анішчанкі), відавочна, з-за таго, што было выдадзена на нямецкай мове.

Тэма судовых органаў на тэрыторыі Беларусі ў разглядаемы перыяд закранута ў шэрагу даследаванняў па гісторыі краю. Адзін з найбольш вядомых прадстаўнікоў заходнерусізму М.В. Каяловіч у працы “Чтения по истории Западной России” выключна пазітыўна ацэньваў “знішчэнне” Кацярынай II на далучаных землях Літоўскага статута [17, с. 316]. Пры гэтым ён адзначаў, што калі ўзнаўленне дзеяння Статута Паўлам I на тэрыторыі, якая ўвайшла ў склад Расіі па 2-м і 3-м падзелах Рэчы Паспалітай, “радавала” (відавочна, мясцовае насельніцтва), то ва ўсходняй частцы Беларусі – “прыводзіла ў адчай”, бо там адвыклі ад яго [17, с. 317]. Апалагетыкай русіфікатарскіх памкненняў імперскіх улад вызначаюцца трактоўкі П.М. Бацюшкова. У негатыўных фарбах ён паказваў пераўтварэнні ў судовай сістэме краю пры Паўле I, прычым як з палітычнай кропкі гледжання (рост польскага ўплыву), так і практычнай (ад папярэдніх парадкаў тут ужо паспелі адвыкнуць) [18, с. 325]. Адпаведна, факт скасавання дзеяння Статута Мікалаем I характарызаваўся выключна станоўча [18, с. 362]. Падобных трактовак прытрымліваўся і Л.М. Саланевіч [19, с. 23, 25].

Як бачым, у большасці расійскіх прац дарэвалюцыйнага перыяду эфектыўнасць пераўтварэнняў судовых органаў і якасць іх функцыянавання ацэньваліся ў кантэксце рэалізацыі палітыкі імперскіх улад па ўніфікацыі краю з унутранымі губернямі.

***Гістарыяграфія 20–80-х гг. XX ст.***

У міжваенны перыяд праблеме судовых органаў на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. пэўная ўвага была ўдзелена ў польскай гістарыяграфіі, якая (прынамсі значная частка гісторыкаў) разглядала ўсю тэрыторыю былой Рэчы Паспалітай як польскую. Адпаведна, у даследаваннях па гісторыі Польшчы ўдзялялася ўвага становішчу на тэрыторыі Беларусі (“краі забраным”) пасля падзелаў. Так, уладкаванню судовай сістэмы і праву тут у канцы XVIII – XIX ст. прысвечаны асобны раздзел 3-га тома капітальнай працы С. Кутшэбы “Historya ustroju Polski w zarysie” (“Нарыс гісторыі дзяржаўнага і грамадскага ладу Польшчы”) [20, с. 208–214]. Становішча ў 1794–1797 гг. на тэрыторыі, далучанай да Расіі ў выніку 3-га падзелу Рэчы Паспалітай, даследаваў Л. Жытковіч [21]. У прыватнасці, ён удзяліў значную ўвагу праблеме фарміравання і дзейнасці тут у гэты час сістэмы судовых органаў. У паказаных Л. Жытковічам дзеяннях расійскай адміністрацыі па яе арганізацыі ў перыяд напярэдадні і адразу пасля 3-га падзелу выразна прасочваюцца два накірункі: аднаўленне судовай сістэмы часоў Рэчы Паспалітай (яна была папярэдне скасавана паўстанцкімі ўладамі), імкненне ў значнай ступені паставіць яе пад свой кантроль [21, с. 104]. Аўтар сцвярджаў, што сістэма кіравання і суда, створаная тут па ўказу Кацярыны II ад 30 кастрычніка 1794 г., мела быць прамежкавым звяном для ўкаранення ў наступным “Учреждений для управления губерниями” [21, с. 86, 106]. Пераўтварэнні ў мясцовай судовай сістэме краю, зробленыя пры Паўле I, Л. Жытковіч таксама ацэньваў неадназначна. З аднаго боку, грамадства было вельмі прывязана да Літоўскага статута [21, с. 113], адпаведна, узнаўленне дзеяння яго норм было фактам пазітыўным. Але з іншага боку, поўнага вяртання да былой судовай сістэмы пры Паўле I не адбылося, суды аказаліся ў значнай ступені падкантрольнымі адміністрацыйнай уладзе (перш за ўсё губернатару) [21, с. 383–387, 391]. У цэлым даследаванне Л. Жытковіча адметна прыцягненнем даволі шырокага архіўнага матэрыялу. Гэта дазволіла не проста паказаць эвалюцыю расійскага заканадаўства ў краі і даць тлумачэнні прыняцця ўладамі тых ці іншых рашэнняў (па-сутнасці, да гэтага зводзілася вывучэнне мясцовай судовай сістэмы разглядаемага перыяду ў пераважнай большасці прац), але таксама падрабязна апісаць выбары суддзяў [21, с. 107], узаемаадносіны адміністрацыйных улад і судовых органаў [21, с. 111], працэс падрыхтоўкі ўвядзення тут “Учреждений для управления губерниями…” (што так і не адбылося ў сувязі са смерцю Кацярыны II) [21, с. 173–185] і іншыя аспекты.

У 1933 г. у Вільні выйшла праца М. Ільяшэвіча “Расейская палітыка на землях былага Беларуска-Літоўскага гаспадарства за панавання Кацярыны II і Паўлы I (1772–1801)”. У кантэксце асвятлення арганізацыі тут сістэмы адміністрацыйнага кіравання і органаў суда ў ёй адзначалася, што спробы ўлад уніфікаваць дадзеныя сферы краю з унутрырасійскімі адразу пасля падзелаў Рэчы Паспалітай не ўдаліся па прычыне моцы “асаблівасцей былой Беларуска-літоўскай дзяржавы” [22, с. 23]. М. Ільшэвіч адзначаў, што ўкараненне “Учреждений для управления губерниями…” у поўнай ступені не адбылося нават на тэрыторыі, далучанай да Расіі ў выніку падзелу Рэчы Паспалітай 1772 г. [22, с. 24].

Савецкая гістарыяграфія разглядала палітыку самадзяржаўя ў нацыянальных ускраінах як рэакцыйную і каланіялісцкую. Адпаведныя ацэнкі даваліся мерапрыемствам урада ў сферы суда на тэрыторыі Беларусі, прычым перш за ўсё – увядзенню тут пры Мікалаі I агульнарасійскай судовай сістэмы, якая характарызавалася выключна негатыўна (падпарадкаванасць адміністрацыйнай уладзе, саслоўнасць, бюракратызм, валакіта, хабарніцтва і г. д.) [23, с. 59–62, 24, с. 179–181, 25, с. 29–30, 26, с. 222, 27, с. 506].

Да разглядаемай у дадзеным артыкуле праблемы звяртаўся У.І. Пічэта [28]. Пераўтварэнні ў сферы суда перыяду праўлення Кацярыны II ім разглядаліся ў кантэксце ў цэлым палітыкі Расіі адносна далучанай у выніку падзелаў Рэчы Паспалітай тэрыторыі. У.І. Пічэта сцвярджаў, што палітыка царызму тут

“заўсёды была эластычнай, але ніколі не выпускала з-пад увагі асноўнага – эканамічнага і палітычнага аб’яднання новых абласцей з імперыяй”. Захоўваючы, у прыватнасці, выкарыстанне ў судах польскай мовы і мясцовага феадальнага права, самадзяржаўе чакала моманту, калі з’явіцца зручная магчымасць поўнага ажыццяўлення намечанай цэнтралісцкай палітыкі [28, с. 25].

Спецыяльна тэме судовых органаў на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. прысвечаны артыкул Е.Л. Бравер [29]. Праца адметна тым, што акрамя ўласна апісання судаўладкавання і судаводства ў краі, паказу эвалюцыі заканадаўства ў гэтай сферы на працягу адзначанага перыяду, у ёй прааналізаваны крыніцы па дадзенай праблеме, якія захаваліся ў Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве БССР у г. Мінску (сёння – Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі). Раскрываючы палітыку расійскіх улад па арганізацыі сістэмы правасуддзя на тэрыторыі Беларусі адразу пасля яе далучэння да Расіі, Е.Л. Бравер адзначыла, што, нягледзячы на імкненне Кацярыны II усталяваць тут агульнарасійскія формы кіравання і суда, Статут ВКЛ не быў поўнасцю скасаваны (ім кіраваліся судовыя органы ў грамадзянскім судаводстве) нават на тэрыторыі Полацкай і Магілёўскай губерняў, дзе былі ўведзены ў дзеянне “Учреждения для управления губерниями…”. Акрамя таго, у справаводстве працягвала выкарыстоўвацца польская мова, хаця цяпер разам з рускай [29, с. 464–465]. На думку аўтара, менавіта нацыянальнае судаўладкаванне і судаводства ў Беларусі аказаліся найбольш устойлівым і сярод іншых галін кіравання, што было звязана з своеасаблівасцямі прававых норм і звычаяў, а таксама спецыфікай саслоўнай структуры [29, с. 465].

Таксама варта згадаць манаграфію амерыканскага даследчыка Э. Тадэна “Russia's Western Borderlands, 1710–1870” (“Заходняе памежжа Расіі, 1710–1870”) [30]. Разглядаючы расійскую палітыку на далучаных у выніку падзелаў Рэчы Паспалітай тэрыторыях, ён адзначыў, што Кацярына II мела намер хутка прыступіць да ліквідацыі Літоўскага статута і “польскіх” судоў. Аднак ажыццявіць ёй гэта, па-сутнасці, не ўдалося. Э. Тадэн падкрэсліў, што тут яшчэ да пераўтварэнняў Паўла I (у тым ліку на тэрыторыі Магілёўскай і Полацкай губерняў, дзе ў 1778 г. былі ўведзены “Учреждения для управления губерниями…”) працягвалі дзейнічаць нормы Статута ВКЛ, а “палякі” – кантраляваць як мясцовую адміністрацыю, так і суды [30, с. 44]. Аўтар тлумачыў гэта адсутнасцю на той момант у расійскіх улад дастатковых ведаў аб мясцовым праве і тым больш параўнаўчых даследаванняў яго з расійскім заканадаўствам, што немінуча прывяло б да канфліктаў паміж мясцовай традыцыйнай і новай расійскай юрыдычнай і адміністрацыйнай практыкай. На думку Э. Тадэна, адмена Статута і ўвядзенне ў краі агульнарасійскай судовай сістэмы адбылося толькі тады, калі расійская юрыдычная навука і адукацыя дасягнулі пэўнага ўзроўню развіцця і самі расійскія законы былі кадыфікаваны. Адпаведна, Расія аказалася ў стане навязаць свае прававыя нормы і суды “былым польскім правінцыям” у даволі ўпарадкаваным выглядзе. Пры гэтым аўтар заўважыў, што нават у канцы 1830-х гг. вядучыя расійскія юрысты ставілі пад сумнеў правільнасць рашэння аб адмене тут Статута [30, с. 54].

***Гістарыяграфія 1990-х – пачатку 2000-х гг.***

У 1990-х – пачатку 2000-х гг. з’явілася некалькі прац, прысвечаных непасрэдна тэме судовых органаў на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст.

Адзіным на сённяшні дзень спецыяльным вучэбным дапаможнікам па разглядаемай праблеме з’яўляецца “Судебные органы в Беларуси: конец XVIII – первая половина XIX веков” В.А. Шаўкапляс [31]. Верхняй храналагічнай мяжой даследавання з’яўляецца ўзыходжанне на расійскі прастол Паўла I. Адпаведна, мерапрыемствы Кацярыны II па арганізацыі сістэмы правасуддзя на тэрыторыі Беларусі не разглядаліся. В.А. Шаўкапляс, грунтуючыся на метадалагічных прынцыпах класавага падыходу, захаванне ў канцы XVIII – першай трэці XIX ст. у краі судаўладкавання ўзору часоў Рэчы Паспалітай тлумачыла тым, што тут працягвалі панаваць феадальны спосаб вытворчасці і феадальныя адносіны [31, с. 7]. Пры гэтым аўтарам паказаны адрозненні, якія мела судовая сістэма краю ў параўнанні з перыядам да падзелаў. Змяненні ў мясцовым праве і сістэме правасуддзя, якія ўносіліся расійскімі ўладамі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст., былі накіраваны на пэўную (але пакуль яшчэ не суцэльную) уніфікацыю іх з унутрырасійскімі парадкамі, а таксама ўмацаванне кантролю над судамі і фарміраваннем іх асабовага складу з боку адміністрацыйных улад [31, с. 8–9, 11, 13, 19, 23–26, 30–31, 33–35, 45, 47]. Галоўная ўвага аўтара ўдзелена павятовым земскім судам, галоўным і межавым судам. Даволі дэталёва паказана іх кампетэнцыя, фарміраванне кадравага складу, узаемадзеянне з іншымі органамі ўлады, а таксама практыка (на прыкладах канкрэтных судовых спраў). Пры гэтым адзначым, што судовая сістэма краю ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. не абмяжоўвалася ўказанымі ўстановамі. На розных этапах дзейнічалі падкаморскія, сіроцкія, совесныя, славесныя, эксдывізарскія суды, магістраты і ратушы, палаты крымінальнага і грамадзянскага суда.

Судовай сістэме на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. прысвечаны артыкул А.П. Жытко і С.А. Талмачовай [32]. У ім дадзена даволі падрабязнае апісанне судаўладкавання, якое ахарактарызавана як шматузроўневае, грувасткае і ў цэлым недастаткова эфектыўнае. У артыкуле падкрэсліваецца саслоўнасць судовых органаў, што стрымлівала працэс складвання грамадзянскай су-

польнасці. Аўтары зрабілі выснову, што скасаванне прыгоннага права, правядзенне іншых рэформ на буржуазнай аснове патрабавалі карэннага рэфармавання судовай сістэмы ў інтарэсах як дзяржавы, так і ўсяго насельніцтва, незалежна ад класавай і саслоўнай прыналежнасці [32, с. 24].

Расійскі даследчык Н.М. Яфрэмава [33] прасачыла эвалюцыю сістэмы судовых органаў на тэрыторыі Беларусі ў перыяд праўлення Кацярыны ІІ, паказаўшы яе асаблівасці на землях, далучаных да Расіі ў выніку розных падзелаў Рэчы Паспалітай. Яна сцвярджала, што ўраду ўдалося дасягнуць хуткай уніфікацыі судовай сістэмы Беларусі з агульнаімперскай, і тлумачыла гэта наяўнасцю агульных прававых традыцый, прававой ідэалогіі, гістарычных прававых каранёў, менталітэту народа. На яе думку, гэта было прагрэсіўнай з'явай, бо спрыяла зараджэнню пачаткаў прававой роўнасці, хаця і ў вузка-саслоўных межах [33, с. 407].

Рэфармаванню расійскімі ўладамі сістэмы судовых устаноў на тэрыторыі Беларусі, а таксама ўдзелу мясцовага дваранства ў камплектаванні іх асабовага складу ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. прысвечаны артыкулы С.Л. Лугаўцовай [34, 35]. Яна сцвярджала, што пасля далучэння да Расіі, як і раней, судовыя ўстановы краю былі незалежнымі ад адміністрацыі. Гэта тлумачылася імкненнем улад знайсці падтрымку ў асяродку шляхты, а таксама немагчымасцю адразу ўкараніць тут расійскае заканадаўства [35, с. 40]. Адносна фарміравання кадравага складу судовых устаноў С.Л. Лугаўцова адзначыла, што пасля далучэння краю да Расіі большасць пасад працягвала замяшчацца мясцовым дваранствам на выбарнай аснове, аднак расійская адміністрацыя імкнулася абмежаваць кола асоб, якія ўдзельнічалі ў выбарах (перш за ўсё за кошт безмаёнткавых дваран) [34, с. 294, 35, с. 41]. Прычым яна падкрэсліла, што пры Паўле І у параўнанні з часам Кацярыны ІІ адбылося зніжэнне ролі вышэйшага саслоўя краю ў дзейнасці судовых органаў [35, с. 41].

Тэма судова-прававой сістэмы на тэрыторыі Беларусі пасля далучэння яе да Расіі знайшла адлюстраванне ў польскай гісторыка-прававой навуцы. С. Годэк апублікаваў некалькі артыкулаў [36, 37, 38] і манаграфію [39] па праблеме ІІІ Статута ВКЛ у перыд пасля падзелаў Рэчы Паспалітай. Ён падкрэсліў вялікае значэнне Статута для развіцця права краін, на тэрыторыі якіх дзейнічалі яго нормы [38, с. 473]. С. Годэк адзначыў, што ІІІ Статут ВКЛ у пэўным сэнсе некаторы час працягваў дзейнічаць у краі нават пасля 1840 г., калі было канчаткова ўведзена агульнарасійскае судовае заканадаўства, бо мела месца практыка палюбоўнага вырашэння спраў на падставе Статута. Гэта, з аднаго боку, было вынікам прыхільнасці насельніцтва да свайго права, а з іншага – дэманстрацыяй патрыятызму [38, с. 492–493]. Працы С. Годэка адметны даволі грунтоўным аналізам наяўнай гістарыяграфіі па вывучаемай праблеме (перш за ўсё польскай, а таксама расійскай), яе сістэматызацыяй і выяўленнем недастаткова даследаваных аспектаў. Таксама варта згадаць артыкул А. Карабовіча і В. Віткоўскага [40], якія, даследуючы гісторыю дзяржавы і права Польшчы, трактавалі дзейнасць Статута ВКЛ пасля падзелаў Рэчы Паспалітай як "польска-літоўскае" права [40, с. 68]. У дадзеным артыкуле паказана эвалюцыя сістэмы судовых устаноў на тэрыторыі, якая была далучана да Расіі ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай, у канцы XVIII – пачатку XX ст. [40, с. 70–71].

Да праблемы судовай сістэмы на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. звярtaўся шэраг даследчыкаў у кантэксце вывучэння іншых тэм альбо ў цэлым становішча краю ў дадзены перыяд.

Я.К. Анішчанка [41], паказваючы палітыку Кацярыны ІІ на тэрыторыі Беларусі, адзначаў, што царызм з першых дзён іх далучэння замацаваў тут верхавенства рускіх законаў, паставіў суды ў залежнае становішча ад адміністрацыі, а дэклараванае захоўванне мясцовых правоў і судаводства аказалася фікцыяй [41, с. 87, 184, 186]. Укараненне ва ўсходняй частцы Беларусі "Учреждений для управления губерниями…", на думку аўтара, мела хутчэй негатыўныя вынікі. Прынцып аддзялення судовай улады ад адміністрацыйнай застаўся нерэалізаваным, а судаводства функцыянавала на падставах спарахнелага, некадыфікаванага рускага і мясцовага заканадаўства, прычым без спроб спалучэння норм іх правапрымянення [41, с. 187]. У цэлым адміністрацыйна-судовы лад гэтага часу Я.К. Анішчанка ахарактарызаваў так: "Гэта быў узаемавыгадны хаўрус (мясцовых землеўладальнікаў і царскай адміністрацыі – *І. Г.*) і карыслівы здзек над бяспраўным народам" [41, с. 187].

Крытычнае стаўленне да палітыкі самадзяржаўя ў сферы правасуддзя на тэрыторыі Беларусі пасля ўключэння яе ў склад імперыі характэрна і для працы В.В. Шведа "Паміж Польшчай і Расіяй: грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772–1863 гг.)" [42]. Аўтар зрабіў выснову, што ўкараненне агульнаімперскага заканадаўства, сістэмы кіравання і суда (няхай і паступовае) адначасова з захаваннем мясцовых прававых норм і ўстаноў прыводзіла да блытаніны і стварэння ўмоў для бюракратычнай валакіты і злоўжыванняў [42, с. 134]. В.В. Швед у сваім даследаванні ўдзяліў пэўную ўвагу стварэнню яшчэ да 3-га падзелу Рэчы Паспалітай (па ўказу Кацярыны ІІ ад 30 касірычніка 1794 г.) Вярхоўнага Літоўскага праўлення на чале з М.В. Рапніным, органы кіравання і суда якога былі падобныя да ўнутрырасійскіх. Гэта трактуецца аўтарам як пераходны этап да ўніфікацыі, якая пачалася неўзабаве [42, с. 119–120].

Праблема фарміравання сістэмы судовых органаў Беларусі і іх кадравага складу ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. знайшла адлюстраванне ў манаграфіі А.А. Кісялёва “Система управления и чиновничество белорусских губерний в конце XVIII – первой половине XIX в.” [43]. Аўтар паказаў эвалюцыю судовай сістэмы краю і асаблівасці кадравай палітыкі ўрада ў перыяды праўлення Паўла І, Аляксандра І і Мікалая І. А.А. Кісялёў даў у цэлым пазітыўную ацэнку пераўтварэнням імперскіх улад, накіраваным на ўкараненне агульнаімперскага заканадаўства ў сферы суда і парадку фарміравання асабовага складу судовых устаноў. Ён сцвярджаў, што ўвядзенне судовай сістэмы па ўзору ўнутраных губерняў мела станоўчае значэнне, бо Літоўскі статут 1588 г. ужо даўно не адпавядаў сучасным патрабаванням [43, с. 76].

Інфармацыя аб судовых органах на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII –першай палове XIX ст. утрымліваецца ў даведніках “Витебская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1802–1917)” [44], “Минская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1793–1917)” [45], “Могилевская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1772–1917)” [46]. У дадзеных выданнях паказана судаўладкаванне ў адпаведных губернях, яго эвалюцыя на працягу адзначанага перыяду, кампетэнцыя судовых органаў, асаблівасці фарміравання іх асабовага складу.

Праблема судовай сістэмы на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. асветлена ў абагульняючых працах па гісторыі Беларусі [47, 48] і вучэбных выданнях па гісторыі дзяржавы і права Беларусі [49–52]. Разглядаемая праблематыка паказваецца ў іх дастаткова схематычна, што звязана перш за ўсё з абмежаванасцю аб’ёму адпаведных параграфаў выданняў такога тыпу. У абагульненым выглядзе падача матэрыялу ўяўляе сабой наступную паслядоўнасць: укараненне ў краі Кацярынай ІІ судовай сістэмы расійскага ўзору – узнаўленне Паўлам І сістэмы правасуддзя часоў Рэчы Паспалітай – ліквідацыя мясцовых асаблівасцей суда Мікалаем І пасля паўстання 1830–1831 гг. Пры гэтым не заўсёды альбо недастаткова выразна паказаны наступныя аспекты: асаблівасці судаводства і судаўладкавання ў 1772–1797 гг. на тэрыторыях, далучаных да Расіі ў выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай; канкрэтныя змены ў судаўладкаванні пры Паўле І; спецыфіка выкарыстання Статута ВКЛ пры Кацярыне ІІ і Паўле І.

***Заключэнне.*** Праблема судовай сістэмы на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. знайшла даволі шырокае адлюстраванне ў гістарычнай і гісторыка-прававой навуцы. Праведзены гістарыяграфічны аналіз дазваляе зрабіць шэраг высноў. У дастаткова поўнай ступені на падставе галоўным чынам заканадаўчых актаў раскрыта судаўладкаванне і яго эвалюцыя на працягу разглядаемага перыяду, паказаны асаблівасці палітыкі розных расійскіх манархаў адносна судова-прававой сферы краю, выяўлена месца і роля мясцовага дваранства ў фарміраванні кадравага складу судовых органаў. Па-рознаму трактуюцца і ацэньваюцца такія аспекты, як спроба Кацярыны ІІ укараніць на тэрыторыі Беларусі расійскі судова-адмінстрацыйны лад у канцы XVIII ст., пераўтварэнні ў судовай сістэме пры Паўле І, эфектыўнасць выкарыстання Статута ВКЛ ва ўмовах XIX ст., значэнне яго скасавання Мікалаем І для якасці правасуддзя краю і некаторыя іншыя. Недастаткова раскрытымі і, адпаведна, перспектыўнымі для далейшага даследавання бачацца наступныя праблемы: роля судовых органаў у сацыяльна-эканамічным развіцці, стасункі паміж судовымі ўстановамі і адміністрацыйнай уладай, функцыянаванне інстытута адвакатуры.

## ЛІТАРАТУРА

1. Обозрение исторических сведений о составлении свода местных законов западных губерний. – СПб. : Т-во Р. Голике и А. Вильборг, 1910. – 64 с.
2. Daniłowicz, I. Kodex Napoleona w porównaniu z prawami polskiemi i litewskiemi / I. Daniłowicz. – Warszawa : Drukarnia Noskowskiego, 1905. – [4], 177, [1] s.
3. Новаковский, М. М. Очерк судоустройства и гражданского процесса по бывшим Статуту Литовскому и Конституциям / М. М. Новаковский. – СПб. : Гос. канцелярия, 1863. – 171 с.
4. Бершадский, С. А. Литовский Статут и польские конституции : историко-юрид. исслед. / С. А. Бершадский. – СПб. : Тип. М. Стасюлевича, 1893. – 114 с.
5. Нольде, А. Э. Очерки по истории кодификации местных гражданских законов при графе Сперанском / А. Э. Нольде. – Спб. : Сенат. тип., 1906.
6. Войшвилло, Е. М. Эксдивизорские суды и их компетенция в губерниях бывшего Великого княжества Литовского в конце XVIII и первой половине XIX в. / Е. М. Войшвилло. – Вильна : Тип. Вилен. православ. Св.-Духов. братства, 1899. – 17 с.
7. Жукович, П. Н. Управление и суд в Западной России в царствование Екатерины II : [сб. отд. публ. из разн. номеров Журн. М-ва народ. просвещ.] / П. Н. Жукович. – Б. м. : б. и., 1914. – 235 (разд. паг.) с.
8. Жукович, П. Н. Западная Россия в царствование императора Павла / П. Н. Жукович // Журн. М-ва народ. просвещ. – 1916. – № 6. – С. 183–226.
9. Нольде, Б. Э. Очерки русского государственного права / Б. Э. Нольде. – СПб. : Тип. «Правда», 1911. – 554 с.

10. Григорьев, В. А. Реформа местного управления при Екатерине II (Учреждение о губерниях 7 ноября 1775 г.). Реформа местного управления при Екатерине II / В. А. Григорьев. – СПб. : Рус. скоропечатня, 1910. – 387 с.
11. Середонин, С. М. Исторический обзор деятельности Комитета министров. К столетию Комитета министров (1802–1902) : в 3 т. / С. М. Середонин. – СПб. : Канцелярия Комитета министров, 1902. – Т. 1. – 607 с.
12. Середонин, С. М. Исторический обзор деятельности Комитета министров. К столетию Комитета министров (1802–1902) / С. М. Середонин. – СПб. : Канцелярия Комитета министров, 1902. – Т. 2. – Ч.1 – 373 с.
13. Середонин, С. М. Исторический обзор деятельности Комитета министров. К столетию Комитета министров (1802–1902) / С. М. Середонин. – СПб. : Канцелярия Комитета министров, 1902. – Т. 3. – Ч. 1.– 358 с.
14. Васьковский, Е. В. Организация адвокатуры : в 2 ч. / Е. В. Васьковский. – СПб. : Тип. П.П. Сойкина, 1893. – Ч. 1 : Очерк всеобщей истории адвокатуры – VIII, 396 с.
15. Никотин, И. А. Столетний период (1772–1872) русского законодательства в воссоединенных от Польши губерниях и законодательство о евреях (1649–1876) / И. А. Никотин. – Вильна : Б. и., 1886.
16. Lehtonen, U. L. Die polnischen Provinzen Russlands unter Katharina II. In den Jahren 1772–1782 / U. L. Lehtonen. – Berlin : G. Reimer, 1907. – 688 p.
17. Коялович, М. О. Чтения по истории Западной России / М. О. Коялович. – СПб. : Тип. А. С. Суворина, 1884. – 309 с.
18. Батюшков, П. Н. Белоруссия и Литва : исторические судьбы Северо-Западного края. Белоруссия и Литва / П. Н. Батюшков. – СПб. : Тип. Тов-ва «Обществ. польза», 1890. – XXIV, 376, 183 с.
19. Солоневич, Л. М. Краткий исторический очерк Гродненской губернии за сто лет ее существования. 1802–1902 / Л. М. Солоневич. – Гродно : Губ. тип., 1901. – 106 с.
20. Kutrzeba, S. Historya ustroju Polski w zarysie : w 4 t. / S. Kutrzeba. – Lwów : Księgarnia Polska Bernarda Połonieckiego, 1920. – T. 3 : Po rozbiorach. – Cz. 1. – 276 s.
21. Żytkowicz, L. Rządy Repnina na Litwie w latach 1794–7 / L. Żytkowicz. – Wilno : Towarzystwo Przyjaciów Nauk w Wilnie, 1938. – 464 с.
22. Ільяшэвіч, М. Расейская палітыка на землях былага Беларуска-Літоўскага гаспадарства за панавання Кацярыны II і Паўлы I (1772–1801) / М. Ільяшэвіч. – Вільня : Друкарня Я. Левіна, 1933. – 24 с.
23. Щербина, П. Ф. Судебная реформа 1864 года на Правобережной Украине / П. Ф. Щербина. – Львов : Изд-во при Львов. гос. ун-те, 1974. – 190 с.
24. Ерошкин, Н. П. История государственных учреждений дореволюционной России. / Н. П. Ерошкин. – М. : Высш. школа, 1983. – 352 с.
25. Довнар-Запольский, М. В. Администрация и суд при Николае I / М. В. Довнар-Запольский. – Баку : Б. и., 1925. – 67 с.
26. Мартинович, И. И. Антинародный характер суда и уголовного процесса дореволюционной России / И. И. Мартинович // Вопросы государства и права. – Вып. 1. – Минск, 1969. – С. 222–231.
27. Юшков С.В. История государства и права СССР : в 2 ч. : учеб. для юрид. ин-тов и фак. / С. В. Юшков. – М. : Госюриздат, 1961. – Ч. 1. – 533 с.
28. Пичета, В. И. Восточная Белоруссия под властью царизма (1772–1796) / В. И. Пичета // Ученые записки. – Вып. 93. – Кн.1. : История. – М. : МГУ, 1946. – С. 20–42.
29. Бравер, Е. Л. К вопросу об истории судебных учреждений Белоруссии конца XVIII – первой половины XIX в. / Е. Л. Бравер // Вопросы архивоведения и источниковедения в БССР : материалы науч. конф. / редкол.: В. Н. Жигалов (отв. ред.) [и др.]. – Минск : Выш. школа, 1971. – С. 458–470.
30. Thaden, E. C. Russia's Western Borderlands, 1710–1870 / E. C. Thaden. – New Jersey : Princeton University Press, 1984. – 292 p.
31. Шелкопляс, В. А. Судебные органы в Беларуси: конец XVIII – первая половина XIX веков : учеб. пособ. / В. А. Шелкопляс. – Минск : Акад. МВД РБ, 1997. – 64 с.
32. Жытко, А. П. Судовая сістэма на тэрыторыі Беларусі (канец XVIII – сярэдзіна XIX ст.) / А. П. Жытко, С. А. Талмачова // Весці БДПУ. Сер. 2. – 2014. – № 2. – С. 20–25.
33. Ефремова, Н. Н. Становление судебной системы Белоруссии в последней трети XVIII – первой трети XIX в. / Н. Н. Ефремова // Гісторыя і сучаснасць: беларуская дзяржаўнасць ва ўсходнееўрапейскім цывілізацыйным кантэксце : зб. навук. прац, прысвеч. 90-годдзю з дня нараджэння прафесара І.А. Юхо. – Мінск : БДУ, 2012. – С. 404–408.
34. Луговцова, С.Л. Реформирование системы судебных учреждений Беларуси в последней трети XVIII в. / С. Л. Луговцова // Працы гістарычнага факультэта БДУ. Вып. 4 : навук. зб. / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2009. – С. 289–295.
35. Луговцова, С. Л. Участие шляхты в комплектовании состава судебных учреждений Беларуси в конце XVIII – начале XIX в. / С. Л. Луговцова // Працы гістарычнага факультэта БДУ. Вып. 2 : навук. зб. / рэдкал. : У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2007. – С. 39–45.
36. Godek, S. O prawie i sądach w guberniach białoruskich w świetle aktów władz rosyjskich z 1772 roku / S. Godek // Zeszyty Prawnicze. – 2010. – T. 10. – № 1. – S. 173–190.
37. Godek, S. Prawo na Litwie na przełomie XVIII i XIX wieku / S. Godek // Zeszyty Prawnicze. – 2011. – T. 11. – № 2. – S. 31–44.
38. Godek, S. III Statut litewski w dobie porozbiorowej – stan badań nad dziedzictwem prawa litewskiego / S. Godek // Stan badań nad wielokulturowym dziedzictwem dawnej Rzeczypospolitej. – Białystok, 2010. – T. II. – S. 473–499.
39. Godek, S. III Statut Litewski w dobie porozbiorowej / S. Godek. – Warszawa: Wydawnictwo Uniwersytetu Kardynała Stefana Wyszyńskiego, 2012. – 810 s.

40. Korobowicz, A. Prawo i sądy na zabranych wschodnich ziemiach Rzeczypospolitej w XIX w. / A. Korobowicz, W. Witkowski // Czasopismo Prawno-Historyczne. – 2003. – T. 55. – № 1. – S. 61–84.
41. Анішчанка, Я. К. Беларусь у часы Кацярыны ІІ (1772–1796 гады) / Я. К. Анішчанка. – Мінск : ЗАТ «Веды», 1998. – 211 с.
42. Швед, В. В. Паміж Польшчай і Расіяй: грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772–1863 гг.) / В. В. Швед. – Гродна : ГрДУ, 2001. – 416 с.
43. Киселев, А. А. Система управления и чиновничество белорусских губерний в конце XVIII – первой половине XIX в. : монография / А. А. Киселев. – Минск : Воен. акад. РБ, 2007. – 171 с.
44. Витебская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1802–1917) / Т. Е. Леонтьева [и др.] ; редкол.: А. К. Голубович (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БелНИИДАД, 2009. – 524, [16] с.
45. Минская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1793–1917) / сост. Т. Е. Леонтьева ; редкол.: В. И. Адамушко (гл. ред.) [и др.] – Минск : БелНИИДАД, 2006. – 392 с.
46. Могилевская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1772–1917) / Е. К. Анищенко [и др.] ; сост.: Ю. Н. Снапковский, Д. Л. Яцкевич ; редкол.: Д. В. Яцевич (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Беларусь, 2014. – 814 с.
47. Філатава, А. Новыя органы і рэжым улады / А. Філатава // Гісторыя Беларусі : у 6 т. – Мінск : Экаперспектыва, 2000–2007. – Т. 4 : Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – 2005. – С. 49–57.
48. Зенчанка, С. В. Усталяванне расійскай сістэмы кіравання / С. В. Зенчанка // Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – Кн. 1. – Раздз. 2.1. – С. 62–79.
49. Вішнеўскі, А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі / А. Ф. Вішнеўскі, І. У. Вішнеўская. – Мінск : Тетра-Системс, 2005. – 192 с.
50. Доўнар, Т. І. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : падруч. Для студэнтаў / Т. І. Доўнар. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2014. – 415 с.
51. Кузнецов, И. Н. История государства и права Беларуси / И. Н. Кузнецов, В. А. Шелкопляс. – Минск : Дикта, 1999. – 272 с.
52. Юхо, Я. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : вучэб. Дапам. : у 2 ч. / Я. А. Юхо. – Мінск : РІВШ БДУ, 2000. – Ч. 2. – 352 с.

*Паступіў 08.10.2016*

## THE HISTORIOGRAPHY OF HISTORY OF THE JUDICIAL BODIES ON THE TERRITORY OF BELARUS AT THE END OF THE18$^{TH}$ – THE FIRST HALF OF THE 19$^{TH}$ CENTURY

***I. HUSHCHYNSKI***

*The historiography of history of judicial system on the territory of Belarus at the end of the 18$^{th}$ – the first half of the 19$^{th}$ century is analyzed. The author drew a conclusion that such aspects as judiciary and its evolution during the period under review, features of the policy of different Russian monarchs towards legal sphere of this region, the role of local nobility in staffing of the courts are sufficiently covered in a historiography. Some aspects are interpreted and assessed by researches in different ways: the attempt by Catherine II to implement there the Russian judicial system, changes in legal system in the time of Paul I, efficiency of use of the Statute of Grand Duchy of Lithuania of 1588 in the conditions of the 19$^{th}$ century, value of its abolition by Nicholas I for quality of justice in the region. For a further research the following problems seem perspective: a role of judicial bodies in social and economic development, the relations between courts and the administrative authorities, functioning of the institute of advocacy.*

***Keywords:*** *historiography, judicial system, court proceedings, judiciary, autocracy, Russian Empire, Statute of the Grand Duchy of Lithuania, 19$^{th}$ century, 18$^{th}$ century.*